3. *Дюркгейм, Э.* Ценностные и «реальные» суждения / Э. Дюркгейм // Социология. Ее предмет, метод и назначение / пер. с фр., сост., послесл. и прим. А. Б. Гофмана. – М., 1995. – С. 286–304.

УДК 351.853(470+571)(476/477)“18/191”

# ЗНАЧЭННЕ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ПОСТСАВЕЦКІХ КРАІНАХ. ДОСВЕД АХОВЫ ПОМНІКАЎ АРХІТЭКТУРЫ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***П. А. Каралёў,*** *магістр гуманітарных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны праблеме захавання гісторыка-культурнай спадчыны постсавецкіх краін. Сёння існуе небяспечная тэндэнцыя, калі па фінансавых прычынах знішчаюцца помнікі архітэктуры, асаблівая гістарычная забудова населеных пунктаў, асаблівасці ландшафту. Не заўсёды спраўляюцца з гэтай праблемай тыя ўстановы, якія адказваюць за зберажэнне помнікаў гісторыі і культуры. Задачамі кожнай з постсавецкіх краін з’яўляюцца папулярызацыя ўласнай нацыянальнай унікальнасці, захаванне помнікаў мінулага і выхаваўчы працэс, які заснаваны на спазнанні культурнай спадчыны.

**Ключавыя словы:** архітэктура, гісторыка-культурная спадчына, архітэктурныя помнікі, зберажэнне аб’ектаў.

# THE MEANING OF HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE IN POST-SOVIET COUNTRIES. EXPERIENCE OF PROTECTION OF ARCHITECTURAL MONUMENTS IN XIX – EARLY XX CENTURY

***P. Karaliou,*** *Master of Arts, leading researcher of the State Literary Museum of Janka Kupala*

**Abstract.** The article is devoted to a problem of preservation of a historical and cultural heritage of the post Soviet countries. For today there is a dangerous tendency when the financial capital destroys separate historical building of cities, monuments of architecture, feature of a landscape. Institutions responsible for the preservation of historical and cultural monuments do not always cope with this problem. The tasks of each of the post-Soviet countries are to popularize their own national uniqueness, preserve the monuments of the past and the educational process, which is based on the knowledge of cultural heritage.

**Keywords:** architecture, historical and cultural heritage, architectural monuments, preservation of objects.

На працягу стагоддзяў стваралася, фарміравалася велізарная гісторыка-культурная спадчына. Тое багацце, якое дазваляе нам чэрпаць не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі веды пра нашых папярэднікаў, іх погляды, але ў той жа час праз гэтыя веды можна спазнаць тое галоўнае, што патрэбна нам сёння. Гэта заўсёды асэнсавалася на працягу стагоддзяў. Яшчэ Цыцэрон адзначаў, што гісторыя – гэта жывая памяць. А ў XIX ст. А. І. Герцэн пісаў: «Больш поўна асэнсоўваючы мінулае, мы разумеем сучаснае» [2, с. 24]. Такім чынам, каб больш сябе зразумець, і чалавек, і нацыя ў пэўны момант звяртаюцца да пытання сваёй гісторыі, культуры, спадчыны.

Сярод усяго багацця гісторыка-культурнай спадчыны помнікі архітэктуры – адны з самых прыгожых. М. Гогаль адзначаў: «Архитектура – тоже летопись мира. Она говорит тогда, когда уже молчат и песни, и предания, и когда уже ничто не говорит о погибшем народе. Пусть же она, хоть отрывками, является среди наших городов в таком виде, в каком она была при отжившем уже народе, чтобы при взгляде на нее осенила нас мысль о минувшем его жизни и погрузила бы нас в его быт, в его привычки и степень понимания, и вызвала бы у нас благодарность за его существование, бывшего ступенью нашего собственного возвышения» [5, с. 24].

Архітэктурныя помнікі ў вялікай ступені дазваляюць нам усвядоміць мінулае, здзівіцца майстэрству нашых продкаў. Але сёння ў постсавецкіх краінах існуе небяспечная тэндэнцыя ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Яе пачатак – 90-я гг. XX ст., калі ў былых рэспубліках СССР вялікі ўплыў на забудову гістарычных цэнтраў гарадоў, іх захаванне зрабіў фінансавы капітал. Калі раней помнікі гісторыі пераважна знішчаліся па ідэалагічных прычынах (храмы і царквы, шляхецкія сядзібы і г. д.), то цяпер пытанне захавання старажытных аб'ектаў залежыць ад фінансавай мэтазгоднасці, эканамічнага росту і развіцця гарадоў. Імкнучыся да сучаснага выгляду, будуюцца бізнес-цэнтры, перабудоўваюцца, а часта і знішчаюцца тыя помнікі, якія маюць непаўторнае значэнне для гэтага населенага пункта. Часцей яны знішчаюцца ўжо ў выглядзе руін, калі лічыцца, што прасцей разбурыць і вызваліць дадзенае месца, чым укладаць грошы і ў захаванне. Гэта праблема мае пагрозлівае значэнне не толькі для Беларусі, але і для Расіі, Украіны, Казахстана і інш., і яе трэба аператыўна вырашыць.

Трэба адзначыць, што гэта праблема не новая. Больш за сто гадоў таму ў Расійскай імперыі назіралася змаганне за захаванне шматлікіх катэгорый помнікаў. Так, у самым пачатку XX ст. разгарнулася грамадская абарона старажытных і рэдкіх будынкаў, адметных мастоў Санкт-Пецярбурга (асноўную дзейнасць па спыненні разбурэння ўзяў на сябе часопіс «Старые годы»). Мноства помнікаў зносілася або аднаўлялася ў зусім іншым выглядзе. Калі ў сталіцы імперыі не дзейнічалі ўказы па ахове спадчыны, то ў правінцыі справы былі яшчэ горш. Напрыклад, Імператарскае Маскоўскае археалагічнае таварыства заступалася за касцёлы дамініканаў у Друйску і кармелітаў у Гродна. Абодва будынкі выклікалі цікавасць як помнікі архітэктуры XVIII ст. Зачыненыя з часоў паўстанняў, у канцы XIX – пач. XX ст. іх пачалі разбіраць на цэглу. На жаль, не дапамаглі звароты таварыства да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

губернскіх начальнікаў, заклікі «прекратить варварство», «принять меры к сохранению интересного памятника старины» [3, с. 77; 6, с. 24].

Развіццё гарадоў, задачы эканамічнага ўмацавання часта шкодзілі захаванасці помнікаў. М. Рэрых у пачатку XX ст. пісаў пра новыя тэндэнцыі ў архітэктуры: «В городах растут дома, художественностью заимствованные из сокровищниц модных магазинов и с претензией на новый пошиб <…> А памятники, наряду с природой, живые вдохновители и руководители стиля, заброшены и пути к ним засорены сушью и педантизмом» [7, с. 9]. Аналагічнае ўражанне і сёння выклікаюць старадаўнія будынкі, пакрытыя сайдынгам, ці адноўленыя «пад даўніну» некалі сапраўдныя помнікі, якія лепш было і не чапаць.

Як і тады, гэтак і сёння службы па ахове помнікаў часта бяздзейнічаюць. Сфера культуры і ахова спадчыны не лічацца досыць важнымі. Як вынік справы па фактам вандалізму не ўзбуджаюцца, мала сапраўднай увагі надаецца да пытанняў захавання ўнікальных аб'ектаў. Удзельнікі Імператарскага Маскоўскага археалагічнага таварыства ў канцы XIX ст. адзначалі: «…немало усилий требовали заботы о сохранении памятников древнего зодчества, погибающих от времени и равнодушия общества, а нередко и от невежества и небрежения лиц, этими памятниками заведующих, и не понимающих, что сломка или невежественная переделка древнего памятника свидетельствует о неуважении к нашей истории, к нашему прошлому, к тому, на чем зиждется и выросло наше историческое призвание, наше национальное значение, наша культура и искусство» [4, с. 28–29].

Як і дзясяткі гадоў таму, сёння не спыняецца працэс змагання за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, самых разнастайных помнікаў: старажытных могілак, капліц, адметных будынкаў. Кожнае, нават маленькае захаванае сведчанне мінулага нясе ў сабе сотні гадоў багатай інфармацыі і асабістую непаўторнасць. Добра пісаў барон М. Урангель пра старажытныя сядзібы, але гэтыя словы можна аднесці і да кожнага будынка з унікальнай архітэктурай: «Каждый дом и каждое жилье имеет свой определенный человеческий характер; в каждом думаешь, живешь и чувствуешь по-разному» [1, с. 161].

Чым лепш зберагаюцца помнікі, тым багацей становіцца гістарычная спадчына. І наадварот, грамадства, якое знішчае сваю нацыянальную спадчыну, звычайна знішчае і само сябе. Нярэдка гэта адбываецца з-за простага неразумення значэння каштоўнасці аб'ектаў. Разам з тым сёння назіраюцца змены ў грамадстве, імкненне да аховы помнікаў, разуменне гэтай праблемы. І таму замест таго, каб толькі крытычна ўспрымаць стан аховы гісторыка-культурнай спадчыны, лепш нагадаць некалі знакаміты выраз: «Разрушено человеческим заблуждением и восстановлено человеческою надеждою».

Каб пазбегнуць трагедыі забыцця, якая вядзе да страты не толькі лепшых помнікаў, але і лепшага ў чалавеку, ужо з ранняга дзяцінства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трэба знаёміць дзяцей з нацыянальнай спадчынай, традыцыямі народа. Напрыклад, расказваць займальныя гісторыі пра ўладальнікаў старажытных сядзіб, гісторыю свайго населенага пункта ці асобнага помніка. М. Рэрых пісаў: «Дайте тогда молодежи возможность смотреть памятники и она, наверное, будет стремиться из тисков современности к древнему, так много видевшему делу» [7, с. 9].

Такім чынам, для кожнай з краін былога СССР важна захоўваць, вывучаць і вылучаць тыя помнікі, тое гістарычнае аблічча, якое будзе прадстаўляць нацыянальную ўнікальнасць кожнай з краін. Напрыклад, беларускія землі ў Сярэдневякоўі былі багатыя на замкі і палацы; Украіна багатая на архітэктурную спадчыну старажытных гарадоў (Кіеў, Львоў), яе землі адны з першых сустрэлі пропаведзь пра Хрыста; Расія прыцягальная сваёй самабытнасцю і багатай культурай XVIII і XIX стст.; Кыргызстан вядомы як старажытны край, дзе праходзіў Вялікі шаўковы шлях, край займальных пошукаў вядомых падарожнікаў, унікальнай прыроды і даўніх традыцый. Такім чынам, кожны рэгіён, кожная краіна багатая на сваё выдатнае мінулае.

Але разам з тым непажадана знішчаць помнікі савецкага часу (манументы, абеліскі, мемарыялы і г. д.). Гэта спадчына таксама з'яўляецца памяццю той эпохі. Пры пагрозе зносу падобных аб'ектаў магчыма прадухіліць іх перамяшчэнне ў спецыяльныя музеі ці паркі.

Гісторыка-культурная спадчына можа прынесці шмат карысці як для дзяржавы (развіццё турызму, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці), так і для асобнага чалавека (фарміраванне годнасці, уплыў на фарміраванне асобы ўвогуле).


*1. Врангель, Н.* Старые усадьбы: очерки истории русской дворянской культуры / Н. Врангель. – СПб. : Журнал «Нева» : ИТД «Летний сад», 1999. – 320 с.

*2. Герцен, А. И.* Собр. соч. : в 30 т. / А. И. Герцен ; Акад. наук СССР ; Ин-т мир. лит. им. А. М. Горького. – М. : Наука, 1954. – Т. 2. – 516 с.

*3.* Древности: труды комиссии по сохранению древних памятников Императорского Московского Археологического общества / под ред. И. П. Машкова. – М., 1912. – Т. IV. – 322 с.

*4.* Историческая записка о деятельности Императорского Московского археологического общества за первые 25 лет существования. – М. : Синодальная тип., 1890. – 308 с.

*5. Комеч, А. И.* Судьба культурного наследия России / А. И. Комеч // Архитектура и ландшафты России. Черная книга. Утраты. – М., 2003. – С. 11–24.

*6.* Протоколы Комисии по сохранению древних памятников за 1903–1904 гг. // Древности: труды Императорского Московского Археологического общества / под ред. В. К. Трутовского. – М., 1907. – Т. XXI. – Вып. 2. – С. 1–74.

*7. Рерих, Н. К.* Берегите старину / Н. К. Рерих. – М. : Междунар. центр Рерихов, 1993. – 72 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ